

# ПАНЦЕЛЯЙМОН ПАНАМАРЭНКА (1902—1984):

## *«Загадка» партыйнай улады*

Столькі супярэчнасцей, «загадак» і таямніц, колькі іх ёсць у біяграфіі гэтага чалавека, наўрад ці знойдзеш яшчэ ў жыццяпісе такога ж рангу партакратаў! І гэта пры тым, што ўладу ў нашай рэспубліцы Панцеляймон Панамарэнка ўзначальваў у самыя што ні ёсць «неспрыяльныя», здавалася б, для ўзлёту гады — з 1938-га па 1948-ы. Пэўны ўздым эканамічнага развіцця краіны ў цэлым і нашай рэспубліцы — у прыватнасці, і побач — масавыя рэпрэсіі соцень тысяч нявінных людзей; аб'яднанне Усходняй і Заходняй частак Беларусі ў адзіную рэспубліку — і тыя ж праследаванні і неверагодна жорсткія пакаранні за іншадумства; нарэшце — самае жорсткае, жудаснае і неверагодна непапраўнае па стратах выпрабаванне: Вялікая Айчынная вайна... І ўсе гэтыя, плюс дзесяткі, калі не сотні іншых праблем, пытанняў, загадак, а часцяком — і самых звычайных таямніц даводзілася вырашаць, «разгадваць», браць на сябе адказнасць за лёсы беларусаў, рызыкаваць і г.д., і да т.п. менавіта яму — першаму сакратару Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі Панцеляймону Кандратавічу Панамарэнку.

Яго ўзлёт па партыйна-бальшавіцкай лесвіцы быў неверагодна імклівы і хуткі. Ужо ў 1918-м — годзе, надзвычай суровым і не да канца «пэўным» адносна становішча ў Расіі, — шаснаццацігадовы Панцеляймон, народжаны на хутары Шалкоўскі цяперашняга Беларэчанскага раёна Краснадарскага краю, уступае ў рады толькі што створанай Чырвонай Арміі. Праз чатыры гады ён вылучаецца на працу ў камсамольскія

органы, а потым — ужо па камсамольскаму прызыву — паступае на вучобу ў Маскоўскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту.

З дыпломам выпускніка гэтай ВНУ Панамарэнка роўна на чатыры гады зноў вяртаецца на службу ў Чырвоную Армію. Менавіта тады яго і заўважылі «сильные мира сего...» У 1936-м Панцеляймон узначальвае партыйную арганізацыю Усесаюзнага электратэхнічнага інстытута, дзе аднак затрымліваецца літаральна на некалькі месяцаў...

Пачатак 1937-га: на працу ў Маскоўскі гарадскі камітэт партыі Панцеляймона Панамарэнку запрашае сам новы лідэр сталічных бальшавікоў Мікіта Хрушчоў. Тыя ж некалькі месяцаў праверкі-«апрабацыі», і восенню таго ж года 35-гадовы ініцыятыўны, актыўны, «мужна» і самааддана настроены таварыш Панамарэнка пераводзіцца на новую пасаду — куды больш сур'ёзную і адказную: інструктарам аддзела кіруючых партыйных органаў Цэнтральнага камітэта ВКП(б). Тут жа, на працягу тых жа некалькіх месяцаў (!), правяраецца, прызнаецца і ў чарговы раз ацэньваецца яго вернасць і аддадзенасць як партыі бальшавікоў у цэлым, так і вышэйстаячаму кіраўніцтву — у прыватнасці, і Панцеляймон Кандратавіч становіцца намеснікам (чытай: правай рукой!) загадчыка аддзела кіруючых партыйных органаў Георгія Малянкова, які адначасова з'яўляўся і сакратаром ЦК ВКП(б)...

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі